# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 3 чэрвеня 1999 года, чацвер, № 11 (1803)


А Ў НАС! А Ў ВАС?

## ПЕРШЫ КРОК ДА "ЯДНАННЯ"

У маі гэтага года адбыўся Устаноўчы з'езд Міжнароднага саюза моладзі "Яднанне", ініцыятарамі стварэння якога сталі студэнты факультэта міжнародных адносін БДУ. Старшынёй Саюза быў абраны студэнт 2-га курса аддзялення міжнароднага права ФМА Вадзім Баравік.

Як сказаў сам Вадзім, ідэя стварэння гэтай арганізацыі ўзнікла ў студэнтаў факультэта яшчэ некалькі месяцаў таму. Для будучых спецыялістаў у галіне міжнародных адносін будзе вельмі карысным вопыт працы ў міжнароднай арганізацыі, якая можа стаць своеасаблівай школай для будучых дыпламатаў. Два месяцы таму быў створаны аргкамітэт. На Устаноўчым з'ездзе зацверджаны Статут. Зараз вядзецца праца над рэгістрацыяй Міжнароднага саюза моладзі "Яднанне" ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Найперш арганізацыя мяркуе надаць вялікую ўвагу навуковай і адукацыйнай дзейнасці: у прыватнасці, вялікім інтарэсам карыстаецца ідэя стварэння Цэнтра па вывучэнні працы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Яшчэ адным важным аспектам дзейнасці стане міжнародны культурны абмен, які паспрыяе ўзаемнаму духоўнаму ўзбагачэнню маладых людзей, лепшаму разуменню звычаяў і традыцый іншых народаў.

Ужо зараз актыўны ўдзел у працы арганізацыі прымаюць прадстаўнікі Расіі, Азербайджана, Арменіі, Кітая і Беларусі. Вялікі інтарэс да працы саюза "Яднанне" выказалі польскія, украінскія, казахскія, латвійскія і літоўскія студэнты.

— Выкарыстоўваючы ў сваёй назве слова "Яднанне", мы гаворым перадусім пра духоўнае, інтэлектуальнае яднанне моладзі, якое можа прынесці рэальную карысць кожнаму члену арганізацыі ў развіцці і станаўленні асобы, — сказаў Вадзім Баравік. — Спадзяюся, што аб'яднаўшы нашы намаганні, мы створым дзеяздольную, мабільную арганізацыю, якая змажа рэальна вырашаць разнастайныя праблемы і плённа супрацоўнічаць з органамі дзяржаўнага кіравання, грамадскімі аб'яднаннямі і міжнароднымі арганізацыямі.

ФЕСТЫВАЛІ

## НА РАДЗІМЕ ПАЭТА

Дастаткова сесці ў цягнік і праехаць 38 кіламетраў на паўночны захад, каб апынуцца ў непаўторным па сваёй прыгажосці кутку беларускай зямлі. Так, гэта Вязынка — радзіма народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

Тут штогод Беларускі дзяржаўны універсітэт праводзіць студэнцкі фестываль. Сёлета гэтая падзея адбывалася 22 і 23 мая. Адкрывала яго дэкан філалагічнага факультэта БДУ прафесар Ларыса Аляксандраўна Мурына, бо праходзіў фестываль пад эгідай якраз гэтага факультэта.



Пасля ўрачыстага адкрыцця адбылося ўскладанне кветак да помніка Янкі Купалы з чытаннем яго вершаў. Была таксама магчымасць у чарговы раз паблукаць па мемарыяльным запаведніку, наведаць хату, дзе нарадзіўся паэт.

Потым надышоў час забаўляльнай праграмы, у якой былі і спартыўныя, і культурныя мерапрыемствы. Спартыўныя гульні былі самымі разнастайнымі: валейбол, футбол, армрэслінг, перацягванне каната. А сярод культурных мерапрыемстваў асабліва хочацца адзначыць конкурс бардаўскай песні. І студэнты, і госці фестывалю маглі не толькі паслухаць мілагучныя спевы, але і паказаць сваё майстэрства ў гэтым жанры.

— Фестываль у Вязынцы стаў для нас ужо традыцыйным, — сказаў старшыня камітэта Студэнцкага саюза БДУ А. Багамазаў. — І мне вельмі прыемна адзначыць, што нягледзячы на блізкія экзамены і на тое, што гэта было свята філалагічнага факультэта, сюды прыехала шмат камандаў з іншых факультэтаў Белдзяржуніверсітэта. Гэта было сапраўднае свята музыкі, спорту, весялосці.

Бясспрэчна, свята атрымалася добрае, і гэтая традыцыя павінна жыць у БДУ.

*Кацярына САЛАДУХА, інспектар упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю*

1999 — ГОД ПУШКІНА

## СВЯТА ПУШКІНА НА ФІЛФАКУ

6 чэрвеня спаўняецца 200 гадоў з дня нараджэння Пушкіна.

Юбілеі вялікага паэта заўжды ператвараліся ў святы, узнаўляючы вялікую цікавасць да асобы генія. Такое свята напярэдадні знамянальнай даты падарылі шматлікім гледачам арганізатары вечарыны, якая адбылася ў актавай зале філалагічнага факультэта 20 мая.

Вечар адкрыў дацэнт А.А. Звознікаў словам пра паэта, у якім вобразна, важка і вельмі пранікнёна сказаў пра Пушкіна. Прамова была сціслай, бо выказаць усё пра паэта немагчыма нават у вялікіх даследаваннях і манаграфіях. Геній Пушкіна нас духоўна ўзбагачае і абнаўляе. А самае галоўнае, што ён — невычэрпная крыніца натхнення, у чым пераканаліся ўсе, хто прысутнічаў на прэм'еры пастаноўкі "Тэатральнай студыі на філфаку" пад кіраўніцтвам прафесійных рэжысёраў Людмілы Ярмак і Сяргея Глебава. У праграме абвяшчалася пяць эцюдаў-імправізацый па творах А.С. Пушкіна, але ўспрымалася гэта відовішча як адзін грандыёзны спектакль, у якім паэт аказаўся не толькі геніяльным прадстаўніком сваёй эпохі, але і нашым сучаснікам. Мы пабачылі за ўсім, што адбывалася на сцэне, жывога Пушкіна, адчулі магутны жыццесцвярджальны пафас яго твораў. У прадстаўленні ўражвала ўсё: і высокае майстэрства акцёраў, і цудоўныя дэкарацыі, і любоў, якой прасякнуты творы паэта... Нават не верылася, што гэтая яскравая прыгожая дзея адбываецца не на сцэне прафесійнага тэатра, а ў звычайнай актавай зале.

Жыццё Пушкіна было трагічным, але геній паэта — святочны, сонечны, вясёлы — асвятляе наша жыццё, дорачы гармонію. І гэтую гармонію, гэты вясёлы, здаровы дух так умела і прафесійна перадалі артысты тэатральнай студыі.

Вось перад гледачом узнік вобраз Арыны Радзівонаўны. А пасля гэтага яны трапляюць у шумны, вясёлы, свабодалюбны свет "Цыганоў" і яшчэ раз перажываюць трагедыю Алека і Земфіры. З дзіўным мастацкім майстэрствам была прадстаўлена паэма "Граф Нулін", дзе ўсе сцэны легкадумнага сюжэта былі паказаны ў руху.

А вось сцэны з сучаснага жыцця падлетка, якому належала граць няпростую ролю Пімена ў драме Пушкіна "Барыс Гадуноў". Гэта так натхніла героя, што ён сам стаў рэжысёрам.

Тры гадзіны пушкінскай вечарыны праляцелі як адно цудоўнае імгненне. І гэтае імгненне падарылі нам рэжысёры, акцёры і, вядома ж, сам Пушкін. Вечар скончыўся, але яшчэ доўга гледачы не хацелі разыходзіцца, узнагароджваючы ўдзельнікаў спектакля кветкамі і бурнымі апладысментамі.

І мне падумалася, што ў наш час, у абстаноўцы напружаных духоўных пошукаў, зацягнутага сацыяльна-эканамічнага крызісу, падзення маральных асноваў грамадства, нам так неабходны Пушкін з яго незнішчальнай верай у духоўную моц чалавека.

*(Працяг тэмы на 4–5-й стар.).*

*Л. І. ЯНКОВІЧ, метадыст бібліятэкі БДУ*

ПОСТФАКТУМ

# ПОМНІЦЬ ВЕНА, ПОМНЯЦЬ АЛЬПЫ І ДУНАЙ...

Мітусня, пачасту пустая, напаўняе нашае жыццё. У гэтым віры мы не знаходзім хвіліны, каб пасміхнуцца, сказаць адзін аднаму добрае слова. Больш таго, многія з нас забываюць аб тых, каму мы абавязаны мірам, жыццём, свабодай. Так-так, аб ветэранах Вялікай Айчыннай вайны. Але традыцыі шанавання ветэранаў, ды і ўвогуле дапамогі пажылым людзям, на шчасце, укараніліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.



Напярэдні Дня Перамогі адбылося віншаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. У гэты дзень гучала мноства добрых слоў, якімі віншавалі і шчыра жадалі самага найлепшага рэктар БДУ Аляксандр Уладзіслававіч Казулін, старшыня Савета ветэранаў БДУ Іван Паўлавіч Зяцькоў, ганаровы старшыня Савета ветэранаў БДУ Таццяна Яфімаўна Дударава, прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Барысавіч Аджаеў, старшыня прафкома супрацоўнікаў Яўген Пятровіч Турамша, а ад маладзёжных арганізацый і студэнцтва БДУ — Раман Крэцу, студэнт 4-га курса філалагічнага факультэта.



Пасля афіцыйнай часткі мерапрыемства быў святочны фуршэт і канцэрт з удзелам фальклорнага гурта Белдзяржуніверсітэта "Тутэйшая шляхта".

А пасля канцэрта адбылося ўскладанне кветак да памятнага знака, размешчанага ў дворыку універсітэта.

*Кацярына САЛАДУХА,*
*інспектар упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю*

*На фотаздымках:*
*старшыня Савета ветэранаў БДУ І. П. Зяцькоў;*
*вечна сэрцам маладыя...*

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# "АКНО Ў ПРЫРОДУ" І "АЛЕЯ БСМ"

Як ні банальна сёння гучыць слова "калектывізм", але, на маю думку, і па гэты дзень для нашай моладзі характэрна такая якасць. Хлопцы і дзяўчаты любяць бываць разам. Адны займаюцца ў тэатральных гуртках, другія гуляюць у КВЗ, некага цягне ў будатрад, а хтосьці аб'ядноўваецца вакол маладзёжных арганізацый, якіх сёння ў Беларусі звыш 65.

Цікаўлюся ў студэнта юрыдычнага факультэта БДУ, члена Беларускага саюза моладзі Юрыя Малышкі, што яго схіліла ўступіць у маладзёжную арганізацыю.

— Мне хацелася ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. Калі працуеш над мэтавай маладзёжнай праграмай, гутарыш са старэйшымі, больш вопытнымі юнакамі, пішаш праекты, спрабуеш гуртаваць вакол сябе моладзь і наладжваць кантакты з чыноўнікамі — набываеш вопыт, які спатрэбіцца ў далейшым жыцці. Акрамя таго, гэтая грамадская дзейнасць уплывае на цябе самога, твой характар: становішся больш энергічным, камунікабельным, ужо неяк творча падыходзіш да сваіх асабістых праблем. І самае галоўнае, набываеш шмат новых добрых, верных сяброў. Дарэчы, асноўная мэта БСМ — стварэнне ўмоў для свабоднага развіцця чалавека, раскрыцця яго творчага патэнцыялу.

**— Юра, ты з'яўляешся старшынёй Асацыяцыі экалагічных клубаў Мінска, якая была заснавана ў маі пры гаркоме БСМ. Хто гуртуецца вакол гэтай арганізацыі, і якія ў яе накірункі дзейнасці?**

— Мэта асацыяцыі — аб'ядноўваць існуючыя экалагічныя гурты, каб разам вырашаць экалагічныя праблемы. Мы ўжо правялі дзве акцыі па ўборцы Севастопальскага парка ад смецця — "Акно ў прыроду" і "Акно ў прыроду-2". У планах — стварэнне базы даных месцаў экалагічнай небяспекі: сабраныя звесткі будзем даводзіць да ведама грамадства, апублікуем экалагічную карту Мінска. Акрамя таго, будзем працаваць па пэўных праграмах, накшталт прыборкі смецця з таго ж Севастопальскага парка.

**— Як узнікла ідэя стварэння асацыяцыі?**

— Беларускі саюз моладзі ўжо праводзіў экалагічныя акцыі. Так, на працягу двух гадоў нашы хлопцы і дзяўчаты ладзілі лагер "Альба-парк": адраджалі адзін са старажытных паркаў у Нясвіжы. Летась адбылася "Алея БСМ" — у адзін вясновы дзень моладзь выйшла дружна саджаць дрэвы. У Мінску "Алея" праводзілася ў Лошыцкім парку, а сёлета ў Лошыцы будзе ўжо працаваць экалагічны лагер. Існавалі і іншыя праекты экалагічнага накірунку, не было толькі органа, які б аб'ядноўваў іх у адну праграму. Асацыяцыя — адно з аб'яднанняў, што будзе гуртаваць вакол сябе моладзь, якую цікавяць пытанні экалогіі і якая хоча бачыць свой горад чыстым і прыгожым. Яшчэ пры гаркоме ў нас створаны экалагічны клуб "Экас" (Экалагічны саюз). Калі Асацыяцыя аб'ядноўвае гурткі школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, дык у "Экас" прыходзяць хлопцы і дзяўчаты, якім не пашчасціла трапіць у экалагічныя гурткі — як мы жартуем, "адзіночкі". Кіруе "Экасам" студэнтка БДУ Святлана Янкоўская. Дарэчы, у Светы нядаўна быў дзень нараджэння, і я хачу павіншаваць яе з гэтым святам.

**— Юра, што б ты пажадаў сваёй арганізацыі?**

— Мне хочацца, каб паказчыкам нашай арганізацыі была не масавасць, а якасць, каб да нас прыходзілі вартыя, энергічныя хлопцы і дзяўчаты, каб мы працавалі адной дружнай, зладжанай камандай і каб нашыя намаганні сапраўды прыносілі карысць, садзейнічалі вырашэнню праблем. А ўсім чытачам "Беларускага універсітэта" хачу пажадаць знайсці магчымасці для рэалізацыі сваіх задумак, ажыццяўлення планаў і здзяйснення мар.

*Алена ДЗЯДЗЮЛЯ*

СПОРТ

# Чарговая перамога Таляронка

Каратэ-до становіцца ў нашай краіне адным з самых масавых і папулярных відаў спорту. І невыпадкова падчас выступлення каратыстаў у спартыўных залах заўсёды шматлюдна.

Не сталі выключэннем і фінальныя рэспубліканскія спаборніцтвы па каратэ-до, якія прайшлі на спартыўнай базе БДПА. 14 вышэйшых навучальных устаноў Беларусі прадставілі самых моцных сваіх спартсменаў. За Белдзяржуніверсітэт выступаў вядомы не толькі ў рэспубліцы каратыст, чэмпіён Еўропы, майстар спорту, уладальнік чорнага пояса першага дана, студэнт 4-га курса юрыдычнага факультэта Аляксандр Таляронак. Сапернікі ў Сашы былі таксама падрыхтаваныя — Юрый Разанаў, Анатоль Шакіра, Раман Шарко. Усе яны ўладальнікі чорнага пояса. Сапраўды, каб перамагчы, спатрэбілася шмат намаганняў. Саша ў чарговы раз даказаў, што ён лепшы. Аляксандр Таляронак заняў першае месца ў індывідуальным ката.



"Таляронак — яркая асоба ў каратэ, у ім гарыць прамететэў агонь перамогі", — сказаў пра яго прэзідэнт Беларускай федэрацыі шотакан каратэ-до, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, галоўны суддзя спаборніцтваў, суддзя вышэйшай нацыянальнай катэгорыі Андрэй Якаўлевіч Вількін.

Нам жа застаецца толькі парадавацца за нашага спартсмена і пажадаць Аляксандру Таляронку перамагчы на чэмпіянаце свету па каратэ-до сярод студэнцкай моладзі ў Японіі, які пройдзе ў 2000 годзе.

*Анатоль КОНАНАЎ,*
*дацэнт ваеннай кафедры*

*На фотаздымку:*
*Аляксандр ТАЛЯРОНАК*

НАДЗВЫЧАЙНАЕ ЗДАРЭННЕ

# ВЫНАХОДКА "ВЯЛІКАГА ПЛАГІЯТАРА"

Даўно ўжо жыве, не затрымліваючыся на паліцах кнігарняў, кніга М.І. Сканаві "Сборник задач по математике для поступающих в вузы". Менавіта з ёй паспяхова рыхтаваліся да ўступных іспытаў цэлыя пакаленні абітурыентаў у СССР, СНД, Расіі і, вядома, Беларусі.

Вось і мы, прафесійныя матэматыкі, дацэнты мінскіх універсітэтаў, парашалі задачы самай складанай групы В з гэтага зборніка, у выніку чаго ў 1995 годзе выдалі на ратапрынце БДЭУ рашэбнік для жадаючых навучыцца рашаць складаныя конкурсныя задачы. У 1997 годзе, удасканаленая і абноўленая, гэтая кніга пабачыла свет у выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя". З таго часу кніга вытрымала пяць выданняў у БелЭн (два апошнія — у 1999 годзе), атрымала выдатныя водгукі выкладчыкаў матэматыкі з Расіі і Беларусі, карыстаецца шырокім попытам. Зацікавіла наша кніга і расійскае выдавецтва "Айрис-пресс", якое сёлета выпусціла дадатковае выданне кнігі "Решение наиболее трудных задач из Сканави". Здавалася б, усё выдатна. Але...

Напрыканцы мая на кніжных прылаўках Мінска з'явілася прыгожа аформленае чатырохтомнае выданне "Полный сборник решений задач для поступающих в вузы", сумеснае выданне "Альянс-В" (Масква) і "Харвест" (Мінск). Прыгожыя і яркія, гэтыя глянцавыя тамы так і просяцца ў рукі. Асабліва захацелася зазірнуць у той з іх, дзе прыводзяцца рашэнні задач групы В. І вось нечаканасць! Апошнія 200 старонак новай кнігі падаліся надзіва знаёмымі і нават роднымі. Чатыры апошнія главы (уся геаметрыя і тэкставыя задачы) былі спісаны з нашай кнігі з незвычайнай "павагай" да арыгінала. З павагай настолькі несумненнай, што супадзенне з арыгіналам на першы погляд падалося стопрацэнтным. (Трэба прызнацца, выснова была занадта паспешлівай: на самой справе, карпатлівая праца па супастаўленні паказала, што працэнт ідэнтычнасці састаўляе толькі 99,99 %. Але пра гэта пазней.)

Першая рэакцыя — абурэнне, гнеў, прыкрасць ад судакранання з нахабствам і несумленнасцю плагіятара. Але пры перагортванні старонак кнігі "вялікага плагіятара" пастаяннае жаданне памыць рукі змянілася пачуццём грэблівага спачування да ўбогіх спробаў пры даслоўным узнаўленні нашых рашэнняў замяніць часам адну літару на чарцяжы на іншую. Аднак трэба аддаць належнае і "творчым" задаткам "вялікага плагіятара", уклад якога пры старанным разглядзе нельга назваць нулявым. У метадычным плане гэты ўклад характарызуецца: рашучай заменай паўсюль у тэксце слова "пусть" на слова "если"; поўным выкараненнем з чарцяжоў літары Q і заменай яе на літару O. Гэтак жа без ваганняў выдалена з чарцяжоў літара P і некаторыя іншыя літары-няўдаліцы. Спіс іншых не менш цікавых "творчых" знаходак спадара плагіятара знаходзіцца ў рэдакцыі "Беларускага універсітэта".

На жаль, творчы патэнцыял плагіятара поўнасцю вычарпаўся пры пераходзе да главы "Прымяненне ўраўненняў да рашэння задач", якая літару ў літару, слова ў слова, памылка ў памылку супадае з адпаведным тэкстам нашай кнігі. Выявіўся, напэўна, няшчаслівы 13 нумар гэтай главы.

Падвядзем некаторыя вынікі: з вышэйсказанага вынікае, што творчыя дасягненні спадара А.А. Ермаліцкага (час ужо, мусіць, рассакрэціць гэтага "творцу") настолькі унікальныя, што забяспечылі заслужанае з'яўленне яго прозвішча ў спісе творчага калектыва аўтараў цытаванага выдання.

Напрыканцы жадаем спадару Ермаліцкаму далейшых творчых поспехаў: не губляць надзеі на дасягненне стопрацэнтнай ідэнтычнасці свайго будучага "дзецішча" з кнігай-арыгіналам.

*А. ЧАРНЯК,*
*Ж. ЧАРНЯК,*
*ахвяры плагіяту*

ПАДПІСКА-99

## ВЕСНІК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

18 чэрвеня завяршаецца падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 1999 года. Падпісная цана часопіса "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" такая:

**Серыя III** (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад) — 200 000 рублёў;

**Серыя IV** (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань) — 200 000 рублёў;

**Серыя I** (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень) — 100 000 рублёў;

**Серыя II** (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік) — 100 000 рублёў.

Часопіс распаўсюджваецца па падпісцы і ў розічны продаж не паступае.

ВЫ ЧУЛІ?

# ШКОЛА АКТЫВУ

У сярэдзіне мая скончыліся заняткі ў школе студэнцкага актыву, арганізаванай Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы БДУ сумесна з упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю.

На працягу двух тыдняў слухачы школы: актывісты органаў самакіравання інтэрнатаў, Студэнцкага саюза Белдзяржуніверсітэта, камітэта БПСМ БДУ, прафкома студэнтаў, савета старастаў факультэтаў — знаёміліся з пытаннямі рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Белдзяржуніверсітэце. Яны даведаліся пра арганізацыю выхаваўчай работы ў інтэрнатах, развіццё сацыяльнай актыўнасці, прававое выхаванне моладзі, вырашэнне канфліктных сітуацый, практычную псіхалогію.



Адкрыў школу прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У. Б. Аджаеў. Ён адзначыў, што гэта ўжо другая школа студэнцкага актыву, якая праводзіцца з мэтай навучання актывістаў навыкам арганізацыйнай працы, вядзення справаводства, знаёмства між сабой, абмену вопытам. Навучальны план школы быў складзены з улікам думак слухачоў мінулай школы актыву і прапаноў студэнцкага актыву.

Для чытання лекцый былі запрошаны, апрача супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта, спецыялісты з Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

Падчас навучання слухачы наведалі інтэрнат № 2, дзе пазнаёміліся з умовамі пражывання студэнтаў, выставу навукова-тэхнічных распрацовак БДУ, на якой іх увазе былі прапанаваны экспанаты навуковых дасягненняў Белдзяржуніверсітэта. На працягу працы школы актыву бібліятэкай універсітэта была арганізавана выстава кніг па пытаннях сацыяльна-выхаваўчай працы сярод моладзі.

*Аляксандр ЛАБКОЎ*

АБІТУРЫЕНТ-99

# ДЗЕНЬ АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

Штогод ва універсітэце праводзяцца Дні адчыненых дзвярэй. У гэты час абітурыенты знаёмяцца са сваімі будучымі выкладчыкамі і кіраўніцтвам універсітэта, болей даведваюцца аб Правілах прыёму і дысцыплінах, якія ім належыць вывучаць. Не ўсе з іх станучь студэнтамі БДУ. Аднак, можа быць, зараз вы бачыце менавіта тых, хто прыйдзе ў наш універсітэт першага верасня.

*На здымках:*
*намеснік старшыні Прыёмнай камісіі БДУ У.Б. Аджаеў, адказны сакратар Прыёмнай камісіі БДУ В.В. Самахвал, дэкан факультэта журналістыкі В.П. Вараб'ёў; абітурыенты БДУ-99.*





# ДЗЕ КАЛІСЬЦІ БЫВАЎ ПУШКІН...

Сёлета спаўняецца 25 гадоў з таго часу, як я з асаблівай цікавасцю пачала вывучаць пушкініяну. Старонка за старонкай, кніга за кнігай, партрэт за партрэтам, малюнак за малюнкам — так спасцігалася мною жыццё, творчасць, разнастайная дзейнасць вялікага прадстаўніка рускай культуры, яго эпоха. Мае веды папаўняліся праглядам драматычных спектакляў на гістарычныя тэмы, кінафільмаў, опер, праслухоўваннем малых музычных твораў таго часу, наведваннем расійскіх музеяў.

Аматар падарожжаў, я пабывала там, дзе калісьці бываў, жыў і тварыў Пушкін, дзе назаўжды пасяліліся яго муза і каханне, мары і надзеі, дабрыня і талент. Я ўвайшла ў таямніцу яго побыту, пабачыла яго асабістыя рэчы, асяроддзе, у якім жыў і працаваў пісьменнік.

Не менш усхвалявала мяне спатканне з праваднікамі светлага вобраза паэта ў нашы дні — арганізатарамі і супрацоўнікамі запаведных мясцін і музеяў, прысвечаных Пушкіну. Асаблівая радасць заўжды застаецца ад сустрэч з Міхайлаўскім і яго ваколіцамі, з іншымі мясцінамі пушкінскага запаведніка на Пскоўшчыне. Назаўсёды мне запомніліся вобразы Героя Сацыялістычнай Працы С.С. Гейчанкі і яго шматлікіх паплечнікаў, якія ўзвысілі памяць аб Пушкіне сваёй працай, паднялі запаведнік з глыбіні стагоддзяў, ваенных руін. Я была ўражана іх вялікім талентам, нязгаснай любоўю да справы і Радзімы, да мясцін, дзе яны працуюць, высокай чысцінёй іх душ.

Непаўторная прыгажосць прыроды тутэйшага краю...

Сёлета спаўняецца 175 год з таго дня, калі ў Міхайлаўскае прыехаў Пушкін, каб змяніць паўднёвую высылку на паўночную, і правёў тут два гады...

Аб усім гэтым ішла мая гаворка перад студэнтамі гістарычнага факультэта універсітэта — будучымі гісторыкамі, музейнымі супрацоўнікамі, педагогамі. Тут жа я арганізавала невялікую выставу кніг з асабістай бібліятэкі, прысвечаных жыццю, дзейнасці, творам Пушкіна і памяці аб ім. Разам з дачкой Вольгай мы прадэманстравалі ўборы, выкананыя ў стылі пушкінскай эпохі: сукенку для дзяўчынкі і ўбор для дамы.

Пушкінскія чытанні я правяла на грамадскіх пачатках і прысвяціла іх 200-годдзю з дня нараджэння пісьменніка. Была рада ўзаемаразуменню, з якім мяне сустрэлі на факультэце беларускія вучоныя — загадчык кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства У.Н. Сідарцоў і дэкан гістарычнага факультэта А. А. Яноўскі.

*С.І. РУСАКОВІЧ, журналіст*

# ДЗВЕ

Хочацца распавесці пра знаёмства А.С. Пушкіна з двума беларусамі, шырока вядомымі грамадскасці Расіі ў першай палове XIX ст. — З.Я. Даленгам-Хадакоўскім (археолагам і этнографам) і Ф.В. Булгарыным (журналістам і пісьменнікам).

Сапраўднае імя Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага — Адам Чарноцкі (1784-1825). Ён нарадзіўся ў Мінскім ваяводстве пад Гайнай (цяпер Лагойскі раён) у сям'і збяднелага шляхціца. Страціўшы апошнія зберажэнні ў час паўстання 1794 г., бацька ўсё ж уладкаваў Адама ў Слуцкае каталіцкае вучылішча. З навук Адам больш за ўсё любіў геаграфію і гісторыю. Па заканчэнні вучылішча (1801) ён праз два гады атрымаў патэнт на права кіраваць маёмасцю і служыў упраўляючым маёнткам графа Несялоўскага ў Вароничы. Нечакана (1809) яго арыштавалі, нібыта за прыхільнасць да Банапарта і жаданне ваяваць на яго баку за незалежнасць Польшчы, і пад аховай адвезлі ў Петрапаўлаўскую крэпасць Пецярбурга. Імператар меў ласку замяніць смяротны прысуд пажыццёвай службай у салдатах. Ва ўсемагутнага ўладара Расійскай імперыі і самога Чарноцкага не магло тады з'явіцца і думкі, што роўна праз 10 год цар падпіша гэтаму «арыштанту» грамату з дазволам неабмежавана наведваць усе землі дзяржавы, карыстацца любымі матэрыяламі з архіваў і сховішчаў, музеяў і бібліятэк і прадпісаннем мясцовым уладам аказваць яму ўсялякую дапамогу і павагу.

...Пасля 7-месячнага зняволення ў адзіночнай камеры Адаму аб'явілі, што ён пазбаўлены шляхецтва і прызначаны радавым салдатам у Омск. Неўзабаве (1811) Омскі батальён, у якім ён служыў, прыбыў у... Бабруйск на тры месяцы. Тут Адам імітуе ўласную смерць праз утапленне ў Бярэзіне і ўцякае на захад. Праз некаторы час ён паявіўся ў Варшаве з планам Бабруйскай крэпасці для французаў і быў залічаны ў канцылярыю маршала Даву. Пасля паражэння Напалеона Адам Чарноцкі ўцякае да сваякоў пад Навагрудак, а потым на Валынь. Тут ён бярэ сабе псеўданім Зарыян Даленга-Хадакоўскі і ўжо да канца жыцця выступае пад гэтым імем.

Напрыканцы 1817 г. Хадакоўскі едзе ў Кракаў, дзе друкуе артыкул «Пра славяншчыну да хрысціянства» ў часопісе «Цвічэння навуковэ» (1818). Тут ён у агульных рысах выказаў сістэму сваіх поглядаў на паходжанне славян і вытлумачыў метады даследаванняў, якія з'явіліся пачаткам распрацоўкі навуковых асноў славянскай археалогіі, этнаграфіі, фалькларыстыкі, дыялекталогіі і тапанімікі. Гэты твор — сінтэз 4-гадовых пошукаў Хадакоўскага. Увагу даследчыка прыцягнулі назвы славянскіх паселішчаў, падобныя між сабой нават у даволі далёкіх адна ад адной краінах, што, на яго думку, таксама павінна было сведчыць аб спрадвечным адзінстве славян. Ён лічыў гарадзішчы выключна славянскай з'явай і на падставе сваёй тэорыі і этнамоўных звестак спрабаваў вызначыць межы старажытнага рассялення славян і лакалізацыю іх асобных плямён ад Урала да Лабы і ад Адрыятыкі да Паўночнай Дзвіны. Ён першым звярнуў увагу на гарадзішчы і бачыў у іх помнікі высокаарганізаванага духоўнага жыцця продкаў і сцвярджаў, што хрысціянства ў параўнанні з язычніцтвам выглядае не як кветнік культуры, а як яе згубіца.



З.Я. Даленга-Хадакоўскі.
(Рэдкі малюнак)

Другім важным фактарам у вызначэнні арэалу рассялення старажытных славян ён лічыў тапанімічныя назвы: першым са славянскіх навукоўцаў Даленга-Хадакоўскі заўважыў каштоўнасць для гістарычнай навукі назваў вёсак, гарадоў, азёр, рэк. Ставячы галоўнай мэтай раскрыць этнагенез славян, вялікую увагу надаваў творам вуснай народнай паэзіі. Атрымаўшы высокую ацэнку такіх выдатных славянскіх вучоных, як І. Лялевель і М. Пагодзін, Хадакоўскі адпраўляецца ў падарожжа на поўдзень Беларусі і захад Украіны. За 5 гадоў вандравання ён абследаваў каля 1000 гарадзішчаў паміж Дняпром і Сілезіяй. Гэта дало яму падставу ўнесці мноства паправак у «Гісторыю дзяржавы Расійскай» славутага Карамзіна і яго карту Старажытнай Расіі (удакладненні тычыліся пераважна тэрыторыі Беларусі, Літвы і Украіны). «Карамзін адрэзаў напалову старажытную Русь, — пісаў Хадакоўскі, — Літве падарыў сённяшнія літоўскія губерні, дзе паміж Вільняй і Гародняй народ гаворыць на беларускай мове». Крытыкуючы ўяўленні Карамзіна аб размяшчэнні ўсходнеславянскіх плямён у IX ст., Хадакоўскі прапанаваў шэраг паправак, засноўваючыся пераважна на тапанімічным матэрыяле. Ён лічыў, што менавіта тапонімы і гідронімы, назвы паселішчаў і водных шляхоў (Волга, Дон, Клязьма, Малога, Нерль, Ака і інш.), дазволяць яму знайсці галоўныя пункты рассялення славянскіх плямён. Ён удакладніў межы рассялення крывічоў, якія «прасціраліся ад Пскова і Смаленска да Гродна і Нёмана». Сцвярджаў, што «Навагрудак быў пабудаваны рускімі», у той час як на карце Карамзіна ён «абазначаны Літвою». Лічыў, што мястэчка Крэва ў Ашмянскім павеце было цэнтрам крывічоў, і першым адзначыў, што Заслаўе, Мінск і Лагойск у старажытныя часы належалі Полацку.

Хадакоўскі выступіў і супраць нарманскай тэорыі, якую падтрымліваў Карамзін і якая сцвярджала вялікую ролю варагаў у працэсе складання Расіі як дзяржавы, проціпаставіўшы ёй сваю гіпотэзу аб «варагах-русі» як адным са славянскіх плямён. Неўзабаве Хадакоўскі знаёміцца з князем А. Чартарыйскім, мецэнатам культуры і прыхільнікам многіх навуковых пачынанняў. З лістом Чартарыйскага да графа Уварава, прэзідэнта Пецярбургскай Акадэміі навук (просьба садзейнічаць у навуковых справах), Хадакоўскі пакідае Беларусь і накіроўваецца ў Пецярбург. Праз некаторы час на старонках маскоўскага «Вестника Европы» быў змешчаны яго артыкул «Даследаванне адносна рускай гісторыі» з крытыкай працы Карамзіна. Артыкул выклікаў вялікую пагалоску ў Маскве і Пецярбургу, папулярнасць Хадакоўскага пачала хутка расці. Ён выявіў у Карамзіна многія памылкі адносна мясцовасцей і тлумачэння некаторых цёмных месцаў у нашых летапісах. Вольнае таварыства аматараў расійскай славеснасці падтрымала Хадакоўскага. Крытыка растрывожыла Карамзіна, а Хадакоўскага гэта падбадзёрыла, і ён стаў дзейнічаць больш смела. Па рэкамендацыі міністра асветы Галіцына Хадакоўскі перадаў свае «фаліянты» на суд Карамзіна. На здзіўленне Хадакоўскага, апошні «не ўзвысіў сваю крыўду над карысцю гістарычнай праўды» і ў дадатках да сваёй «Гісторыі» змясціў багата яго заўваг. Хадакоўскі быў абраны членам-карэспандэнтам «Вольнага таварыства» (1819).

Хутка ён складае «Праект вучонага падарожжа па Расіі для вытлумачэння старажытнай славянскай гісторыі», надрукаваны ў часопісе «Сын Отечества» (1820, №№ 33-35, 38-40). Вялікая ўвага ў ім надаецца тапанімічнаму,

# СУСТРЭЧЫ

фальклорнаму і дыялектнаму матэрыялу. Хадакоўскі плануе наступны маршрут свайго падарожжа: па Няве да Старой Ладагі, па Волхаве праз Ноўгарад да вытокаў рэк Волгі, Заходняй Дзвіны, Дняпра і Масквы. У наступны год ён меў намер праз Северскую зямлю пайсці ў Крым, потым узбярэжжам Азоўскага мора да вытокаў Дона і назад на поўнач — да Белага возера і Паўночнай Дзвіны, адсюль зноў па Волзе на ўсход, да старажытнага Булгара і Уральскіх гор. Пасля вяртання ён збіраўся аб'ехаць землі літоўцаў і накіравацца да вытокаў Днястра, Прута і нарэшце да Дуная — у зямлю сучасных балгараў. Падарожжа было разлічана на 4 гады. Дэпартамент народнай асветы падтрымаў гэты праект, Галіцын далажыў імператару, і той налажыў рэзалюцыю «Быць по сему» (пад сцягам Міністэрства ўнутраных спраў і Святейшага Сінода!). Падарожжа Хадакоўскага пачалося 17.06.1820, і ў канцы кастрычніка 1821 г. навуковец прыбыў у Маскву са справаздачай за першы год даследаванняў. Але нечакана Карамзін даў адмоўны водгук, і фінансаванне спынілася (Карамзін, безумоўна, баяўся, каб Хадакоўскі наогул не «ўзарваў» яго «Гісторыю»).

Але ўсё ж Хадакоўскі абудзіў вялікі інтарэс у рускіх навукоўцаў таго часу да гісторыі беларускага народа, яго духоўнай культуры і мовы. Ён упершыню адкрыў для рускай навукі, што беларуская мова мае даўнюю гісторыю; межы крывіцкага дыялекту, з якога ўтварылася беларуская мова, паводле Хадакоўскага, пачынаюцца ад Друі на Дзвіне да ваколіц Вільні і Коўна, у Валыні — па рысе ад Роўна праз Ноўгарад-Валынскі да Жытоміра; беларускую мову абмяжоўваюць на ўсходзе Калужская, Маскоўская і Яраслаўская губерні (губерні Пскоўскую, Наўгародскую і Цвярскую ў лінгвістычных адносінах Хадакоўскі далучае да Беларусі). І яго погляды ўспрынялі і прапагандавалі такія расійскія аўтэрытэты, як Кірэеўскі, Пагодзін і інш.

Архіў Хадакоўскага складаў 3000 фальклорных твораў, назвы больш 5000 гарадзішчаў (55 з марфемамі «бог» и «буг»), а яго тапанімічны слоўнік меў 1500 назваў. Ні адзін з навукоўцаў да Хадакоўскага не выканаў такога аб'ёму работы, не даследаваў такой вялікай прасторы славянскай зямлі, не перанёс столькі цяжкасцей у імя навукі. Будучы ў крайняй беднасці, Хадакоўскі ў жніўні 1823 г. пасяліўся ў вёсцы Пятроўскае Цвярской губерні і як вучоны замоўк назаўсёды. Тут Хадакоўскі 17.11.1825 г. (на 41-м годзе жыцця) памёр і быў пахаваны на могілках па Валагодскай шашы ў 10 вёрстах ад Цвяры. Невыдадзеным засталося мноства каштоўных матэрыялаў — такога велізарнага матэрыялу, сабранага ў палявых умовах і падрыхтаванага працай аднаго чалавека, у гісторыі славістыкі да таго часу не было. Зараз яго архівы знаходзяцца ў Публічных бібліятэках Пецярбурга і Масквы.

Хадакоўскі быў вялікім патрыётам — ён не аддаў перавагі ні аднаму са славянскіх народаў, бо скрозь глыбіню стагоддзяў бачыў адзіную і моцную супольнасць славян — з адзінай мовай, культурай і побытам. Ён паказаў шляхі для славяназнаўчай навукі і нацыянальнай самасвядомасці.

Апантанасць і беднасць Хадакоўскага здабылі яму рэпутацыю жабруючага дзівака. Былі, аднак, і палымяныя паклоннікі энтузіяста, якія прыпісалі яму стварэнне цэлай «гістарычнай сістэмы». І сярод іх А.С. Пушкін. Паэт з павагай ставіўся да Хадакоўскага як да найпершага аўтарытэта па гісторыі славянскіх народаў. У сваім артыкуле пра «Песню пра паход Ігаравы» (1836), Пушкін падкрэсліў: «...Ходаковский никогда не усомнился в подлинности «Песни о полку Игореве», а ў паэме «Езерский» (1833) ёсць такія пушкінскія радкі:

*...новый Ходаковский,*
*Люблю от бабушки московской*
*Я слушать толки о родне,*
*Об отдаленной старине.*

У вершах ёсць адценне іроніі, але ў артыкуле навуковага характару суразмоўца «московской бабушки» адносіць Хадакоўскага да апосталаў навукі. З павагай ставіўся паэт і да архіва Хадакоўскага. Такім чынам, Пушкін цаніў заслугі «вядомага любіцеля старажытнасцей» вельмі высока.

Пушкін ведаў многіх археолагаў пачатку 19 стагоддзя. У Пецярбургу ён часта бываў у хаце А. Аленіна, які многа зрабіў для вывучэння старажытнарускіх помнікаў, у Адэсе пазнаёміўся з І. Бларамбергам і І. Сцямпкоўскім — двума заснавальнікамі антычнай археалогіі Паўночнага Прычарнамор'я. У 1830-х гадах сяброўскія адносіны з паэтам імкнуліся завязаць егіптолаг І. Гульянаў і нумізмат А. Чарткоў. Але ў творах і пісьмах Пушкін аб іх не кажа ні слова. На гэтым фоне асобнае значэнне набывае і жартоўнае параўнанне сябе з Хадакоўскім, і спасылка на яго аўтарытэт пры абвяржэнні поглядаў скептыкаў на «Слова пра паход Ігаравы».

Ці сустракаўся Пушкін з Хадакоўскім? Безумоўна. Хадакоўскі прыехаў у Пецярбург у кастрычніку 1819 г., а Пушкіна выслалі адтуль на поўдзень у маі 1820 г. У Пецярбургу Хадакоўскі бываў у Карамзіна, у гэтыя ж дні заходзіў да Карамзіна і Пушкін. Пасапраўднаму Хадакоўскі зблізіўся з Ф. Глінкай, з якім і Пушкін вельмі сябраваў. У пратаколах пасяджэнняў Вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці за студзень-сакавік 1820 г. імя Хадакоўскага стаіць побач з імёнамі сяброў Пушкіна — Дэльвіга, Кюхельбекера, Плятнёва. Не выключана, што Пушкін і Хадакоўскі сустракаліся, і неаднаразова.



І ўжо ва ўсялякім выпадку паэт бачыў яго працы — «Проект ученого путешествия» друкаваўся ў тых жа нумарах «Сына отечества» за 1820, дзе разгортвалася палеміка наконт «Руслана і Людмілы». Чаму ж Пушкін яўна аддаваў перавагу няўдачніку Хадакоўскаму перад салíднымі і агульнапрызнанымі? Вядома схільнасць паэта да «своеасаблівых» людзей, якія выдзяляліся з безаблічнага натоўпу. Яскравай і каларытнай фігурай быў і Хадакоўскі, хоць і дзівак. Але не толькі гэта спадабалася ў ім Пушкіну. Хадакоўскі — знаток «древностей, таящихся в наречьях, поверьях и местностях славянских народов». Такая характарыстыка Пушкіна дапамагае разабрацца ў тым, што імпаніравала яму ў дзейнасці Хадакоўскага. Гэта пошукі ў галіне этнаграфіі і фальклору, якіх цураліся другія археолагі пачатку 19 стагоддзя. Сутыкненне са светам народных казак, песень і легендаў у доўгія месяцы міхайлаўскай ссылкі мела вялікую ролю ў творчасці Пушкіна. Адсюль і інтарэс да збіральніка і тлумачальніка нашых «поверий и наречий». Безумоўна, Пушкін хацеў выратаваць ад забыцця вынікі заняткаў Хадакоўскага «живой стариной» і займаўся справамі яго архіва.

Другое цікавае знаёмства паэта звязана з журналістам і пісьменнікам Фадзеем Булгарыным (1789-1859), асобай у многіх адносінах «забаўнай» і даволі «цёмнай». Нарадзіўся ён у маёнтку Пырашава на Міншчыне ў сям'і шляхціца. Пасля таго, як яго бацьку за забойства рускага генерала саслалі ў Сібір, маці з сынам пераехала ў Пецярбург. У 1806-1807 гг. Булгарын удзельнічаў у ваенных дзеяннях супраць французаў, а ў 1811 г. паступіў у армію Напалеона і даслужыўся да капітана. Ваяваў супраць Расіі, пакуль не трапіў (1814) у палон да прусакаў. Пасля вайны асеў у Варшаве, а ў 1820 г. перабраўся ў Пецярбург, дзе праз два гады стаў выдаваць часопіс «Северный архив». Быў у сяброўскіх адносінах з Грыбаедавым, Рылеевым, Кюхельбекерам і адначасова з ...Аракчэевым. З 1825 г. да канца свайго жыцця выдаваў палітычную і літаратурную газету «Северная пчела» казённа-патрыятычнага кірунку, маючы пры гэтым манапольнае права друкаваць палітычныя весткі. Будучы «сваім чалавекам» у ІІІ Аддзяленні, складаў даносы на В.Р. Бялінскага, М.А. Някрасава, М.В. Гогаля і ў першую чаргу на А.С. Пушкіна (паэт Вяземскі даў Булгарыну мянушку «Фіглярын», якую ведаў увесь Пецярбург).

Аднойчы Булгарыну, быццам між іншым, паказалі ў ІІІ Аддзяленні адзін «цікавы дакумент». Булгарын намёк зразумеў і надрукаваў у «Северной пчеле» кароткую нататку, ў якой гаварылася быццам «шкіпер» [Петр І] аднойчы «даказваў» свайму памочніку [Меншыкаву], што «ён купіў негра [Ібрагіма Ганібала] за бутылку рому!». Імператар Мікалай І, якому паведамілі аб гэтым, «далікатна» адмежаваўся ад гэтай справы, наказаўшы перадаць Пушкіну: «Такія нізкія і подлыя знявагі, якімі яго пачаставалі, ганьбяць не таго, да каго яны звернуты, а таго, хто іх вымаўляе. Адзіная зброя супраць іх ёсць пагарда». Пушкін жа ў адказ на гэтую ганьбу надрукаваў вершы:

*Решил Фиглярин, сидя дома,*
*Что черный дед мой Ганнибал*
*Был куплен за бутылку рома*
*И в руки шкиперу попал...*
*Сей шкипер деду был доступен,*
*И сходно купленный арап*
*Возрос, усерден, неподкупен,*
*Царю наперсник, а не раб.*

І надалей паміж паэтам і Булгарыным былі абсалютна варожыя адносіны. Але гэтыя адносіны не характарызуюць Пушкіна як злапамятнага ці капрызнага чалавека. Паводле водгукаў сучаснікаў, Булгарын (прадажны журналіст і супрацоўнік тайнай паліцыі) выклікаў пачуццё агіды, усё ў ім было непрыемна — і знешнасць, і біяграфія, і натура.

Такія вось два знаёмствы Пушкіна з ураджэнцамі Беларусі. У адным выпадку глыбокая павага да таго, хто стаў прадметам кпінаў і быў адрынуты ўрадавымі коламі (Хадакоўскі), а ў другім — поўная непрыязь да таго, хто карыстаўся апекай самога імператара (Булгарын).

*Валерый ЯРМОЛЕНКА,*
*доктар геаграфічных навук*

# ПІВА АРШАНСКАГА БРОВАРА

Зміцер ДЗЯДЗЕНКА

У маім горадзе на старажытным замчышчы сабакары выгульвалі сваіх гадаванцаў. Аднак гэтае месца любілі не толькі яны: на падножжы стылізаванай брамы-помніка было вельмі зручна рассцілаць газету і, расклаўшы на ёй такі-сякі заедак (хлеб, нарэзаная скрылёчкамі вараная каўбаса, марынаваныя гуркі), ставіць паўзверх пляшку прыстойнага віна. Вядома, калі п'еш у добрай кампаніі, вечаровай парой, паглядаючы на Дняпро, на Ільінскую царкву за ім (пастаўленую ў памяць таго, што колькі стагоддзяў таму тут не паспела патануць жонка вялікага князя), у душы абуджаецца штосьці паэтычна-настальгічнае — настрой, які Джон Стэйнбек адзначыў як «крыху ніжэй за дзве цалі ад рыльца першай пляшкі».

Спяшацца няма куды: даліць віно нам аніхто не зашкодзіць, бо сабакары разлюбілі гарадзішча пасля таго, як да юбілею горада тут спілавалі дрэвы, бульдозерам параўнялі паверхню і на сплюндраванае месца («ахоўваецца дзяржавай») паклалі дарожкі з плітаў. Зрэшты, браму ўсё ж такі пакінулі, таму мы цяпер і тут.

Але спяшацца і праўда няма куды. Можна весці гаворку пра аршанскі замак, які стаяў тут. На гэтым самым месцы, дзе п'ем мы, магчыма, у пачатку семнаццатага стагоддзя Жыгімонт Ваза, ідучы на Масковію, піў якую-небудзь малмазію ці мадэру, рыслінг ці «караля вінаў» — такай... Шкада, што мы не ведаем схільнасцяў караля і вялікага князя!..

Зрэшты, не будзем адмаўляць такую мажлівасць, што піў ён тут не штосьці выкшталцона-замежнае, а звычайную гарэлку або піва з запасаў аршанскага замка (піва ў нас любілі: нездарма ж нават у інвентары 1560 года адзначаліся «чатыры піўніцы пустых»).

Прыгадаўшы піва, мы адразу ж, без сумневу, зазначым, як няўдала эксплуатуецца аршанскім браварам тэма замка, як і наогул гістарычная тэматыка. Ну, добра, выява замка на «нацыянальным аршанскім» напоі «Оршад». Піва «Куцеінскае», «Аршанскае» (ізноў жа з выяваю замка) і — «Баярын Орша»... Колькі, дарэчы, назоваў можаш прыдумаць ты? «Замкавае» — раз, «Сапежынскае» — два, «Сангушкаўскае» — тры, «Ратушнае» — чатыры... (Што праўда, апошняе — дужа трапна: ратуша — сама тое месца, дзе без піва — аніяк!) Колькі змагу прыдумаць я? «Манаскае» — раз, «Каралеўскае» — два (зрэшты, для такога назова трэба ці высокая якасць трунка, ці празмерная нахабства вытворцы), «Мяшчанскае»— тры, «Белы Ковель» — чатыры... Працягваць будзем?..

Правільна, у нас ёсць мора добрых назоваў, але дзе ж узяць столькі добрага піва? Пытанне рытарычнае, а на такія, як вядома, ніхто не адказвае.

**Хаця, *зазначаеш ты*, з гэтага гледзішча, найгоршай сітуацыя падаецца ў Полацку: у іх такая гісторыя, што пры ейнай эксплуатацыі можа не хапіць не толькі добрага, але і дрэннага піва...**

**Вядома, у іх там адных дзеячоў культуры ды асветы — незлічоны край, не кажучы ўжо пра ваяроў. А князі?!**



**Ды каб нам аднаго такога князя — дык не спатрэбілася б аніякага «Баярына Оршу» шлёпаць на этыкетку! Уяўляеш — піва з густоўнай этыкеткай «Князь Аршанскі», зробленай гэтак жа сама, як яны стылізавалі пад Дзюрэра гэтага паганага «Баярына Оршу»? Дальбог, пры ўсім маім піўным піетэце купіў бы пляшку такога напою, якой бы аслінай мачой ён ні выявіўся!..**

**Але ж, на вялікі жаль, такога князя няма. Або папросту не ведаем...**

Ты змаўкаеш, пацягваючы віно. Апускаецца ціша — такая нехарактэрная для горада: за Дняпром раз-пораз гарланяць пеўні, не парушаючы, зрэшты, ідылічнага вечаровага супакою.

Я таксама доўга маўчу. Не ведаю, ці распавядаць табе. Урэшце, я ж і сам не дужа ўпэўнены.

Ты памятаеш, *наважыўся вымавіць я*, у Тэадора Нарбута ёсць згадкі пра князя Гінвіла-Оршу?

Твая рэакцыя менавіта такая, як я і чакаў. Вядома, ты памятаеш. І нават памятаеш, што гэты Гінвіл згадваецца яшчэ ў Длугаша... Аднак жа агульнапрызнана, што гэта міфічны князь! Дый куды ён з такім імем да славянскае Аршаншчыны?!

Пачакай, не прыспешвай... Натуральна, тое, што я зараз буду распавядаць, ты не знойдзеш у аніводным летапісе або якой-кольвечы манаграфіі. Дзеі гэтыя былі настолькі невыгодныя нават сучаснікам, што яны замоўчвалі іх... А летапісцы... А што — летапісцы?.. Ты ж сам ведаеш, што яны пісалі на дагоду ўладарам. Дык і пісалі так, каб спадабалася замоўцу. Адпаведна ж і падзеі ў кожным летапісе даюцца па-свойму. Вунь колькі нараканняў гучыць, што не дайшлі да нас Полацкія летапісы, дзе была б нашая, беларуская версія падзеяў!..

Але ж ёсць рэчы, якія не згадваюцца нікім. Бо гэта невыгодна. А калі і згадваюцца, дык адно каб спляжыць, сплюндраваць і зняважыць. Гэткі рытуальны «танец на костках».

Не ведаю, як з тым Гінвілам (што тут Нарбут наблытаў — я пакуль што не разабраўся), але ёсць ускосныя звесткі пра аднаго з князёў, які, нібыта, жыў у Оршы. Мяркуючы па ўсім, гэта і быў аршанскі князь. Імя яму — Усяслаў.

Ты перапыняеш мяне. Канешне, цябе цікавіць стагоддзе. Даведаўшыся, што гаворка ідзе пра адзінаццатае, ты ў разгубленасці апукаеш пляшку, з якой збіраўся даліваць віно, і я працягваю расповед «насуха».

Так, менавіта Усяслаў. Быў ён Рагвалодавічам ці Рурыкавічам — нідзе не гаворыцца. Увогуле, з ягоным паходжаннем — вялікая блытаніна. Гэты самы Гінвіл яму даводзіцца ці то дзедам, ці то дзядзькам па маці. Бацьку розныя летапісы называюць розна, а некаторыя проста кажуць, маўляў, «прыйшоў і стаў княжыць у сваёй бацькаўшчыне».

Адкуль прыйшоў?.. Тут яшчэ адна цікавая гісторыя. Ягонае нараджэнне было адзначанае благімі прыкметамі: зіма была з лютымі маразамі, год — неўраджайны. Ды ў дадатак у дзень (праўдзівей — у ноч, бо нарадзіўся ён бліжэй апоўначы) нараджэння ў небе было два месяцы. Акрам таго, у адным з летапісаў гаворыцца, што пры хрышчэнні малога княжыча ў нябёсах бачылі нейкі «паганскі знак».

Паколькі ўсё гэта палічылі кепскай прыкметай, далёкія сваякі Усяслава пасля ранняй смерці ягоных бацькоў адаслалі малога кня-

зя ў Візантыю. Вядома, што яны, мабыць, проста скарысталіся нагодай, каб надаць сваім дзеянням выгляд законных, зрабіць з дзярма цукерку. Але ж летапісцы кажуць адно пра благія знакі...

**Пачакай,** ***перапыняеш ты зноў.*** **Гэтыя звесткі з летапісаў ці якія ўскосныя?**

Ускосныя, *пацвярджаю я, адпіваючы віно, налітае нарэшце табой. Прыемны корсткі прысмак прымушае на хвілю змоўкнуць, каб найпаўней адчуць асалоду напоя. Пасмакаваўшы, я ўрэшце каўтаю віно, каб казаць далей.*

Як вядома, у вялікага бібліяфіла князя Сямёна-Самуэля Сангушкі-Ковельскага быў аграмадны кнігазбор. З тых кніжак мала што дайшло да нас (усё ж такі ён памёр у 1638 годзе, а гэта значыць — больш за 350 гадоў таму). Аднак тое-сёе ацалела, як, напрыклад, малітоўнік «Hore dive Virginis Mariae secundum verum usum Romanorum», выдадзены ў Парыжы ў 1505 годзе. Сам зборнік з гэтага гледзішча мала цікавы, а вось запіс на вокладцы... Карацей, там напісана прыблізна так (натуральна, падаю пераклад): «Варта гараўнаць нумар 27 з расповедам «Аршанскай хронікі» пра Усяслава Шэрага». Я прасіў перакласці лацініставу — там якраз гаворыцца пра падобныя «паганскія звабы».

Натуральна, што ніякая «Аршанская хроніка» нідзе болей не вядомая. Верагодна, гэта быў мясцовы летапіс кшталту Баркулабаўскага, адно што сягаў далейшых часоў, беручы за прыклад больш вядомыя хронікі. Я падазраю, што «Аршанская хроніка» (вядома, калі не загінула ў якім пажары ці не была знішчаная жаўнерамі ў незлічоных войнах) зараз спакойна перахоўваецца дзе-небудзь у архівах Піцера альбо Масквы.

Але — вяртаючыся да Усяслава... У Візантыі ён пражыў, трэба думаць, некалькі гадоў. На жаль, Міхаіл Псел у сваім «Хранографе» не адзначае ганаровых вязняў пры імператарскім двары. Але згадкі пра княжыча (не, ужо, відаць, князя) ёсць у Макарыя Сілістрыцкага і Іосіфа Махітарыя. Яны адзначаюць, што князь не па ўзросце разумны, добра абазнаны ў рыцарскіх навуках, але мала набожны, што не пасуе асобе такога высокага паходжання.

Малады князь да таго ж, як піша Махітарый, быў удзельнікам аднаго з «палацавых пераваротаў». Па ўсім відаць, займаў ён не апошняе месца, бо быў сасланы на выспу разам з прэтэндэнтам на сталец, паводле звычаяў таго часу. Вярнуўся ж да двара толькі праз год, пры чарговай змене імператара...

Дакладны час ягонага вяртання з Візантыі невядомы, але вярнуўся ён ужо князем, уладаром і сеў княжыць у Оршы.

Тут, уласна, ідуць ізноў розныя дзівосы і цікавосткі. Князь, больш схільны да паганства з ягонымі варажбітамі і жрацамі, атрымлівае мянушку Шэры. Першая асацыяцыя на гэтае слова якая?.. Правільна — воўк: хадзіла пагалоска, што ён мог ператварацца ваўком на ўласнае жаданне. Гэтаму навучылі яго тутэйшыя ведзьмакі. А візантыйскія магі, аднаго з якіх ён прывёз з сабою, навучылі яго розным іншым чарадзействам, пра якія і казаць страшна...

**Гэта ж амаль полацкі Усяслаў Чарадзей,** ***не вытрымліваеш урэшце ты.***

Не зусім, *спакойна адказваю я.* Усяславу Чарадзею пазнейшыя летапісцы папросту прыпісалі нейкія рысы. Але гэта было менавіта што пазнейшае напластаванне. А з Усяславам Шэрым іх пачалі блытаць па прычыне таго, што жылі гэтыя два Усяславы адначасна. І вось дзеі менш вядомага аршанскага князя сталі прыпісваць полацкаму.

**Але ж летапісы,** ***не верыш ты.*** **Не мог жа знікнуць з памяці, сысці ў нябыт князь, чыё імя знітаванае з такімі легендамі!..**

Натуральна, не мог. *(Я згаджаюся, чаму ж бы я мусіў пярэчыць?)* І летапісцы, верагодна, згадалі б пра аршанскага князя. І нават — абавязкова згадалі б, каб не адна акалічнасць.

Я бачу, што зацікаўленасць у тваім позірку ўсё больш узрастае. Я ведаю, што ты любіш кожную сітуацыю «ацэньваць крытычна». Аднак я ведаю і тое, што твая любоў да гэтага горада большая за такі «крытыцызм» і ты змог бы прыняць нават не зусім верагодны расповед, калі б ён быў прыгожа, густоўна пададзены.

Узнікла тая акалічнасць, *кажу я, цэдзячы віно,* што аршанскі князь не захацеў стаць нават намінальна васалам аніводнага з суседзяў: полацкага і смаленскага князёў ён лічыў роўнымі сабе, хаця і меў нашмат меншае за іх княства; а Ізяславічам, якія трымалі за сабой кіеўскі сталец і таму лічыліся зверхнікамі над іншымі князямі, дык і наогул даслаў выклік.

Вынік?.. Хіба яго так цяжка вылічыць? Канешне, Усяслаў Шэры ня змог супрацьстаяць злучанаму войску іншых князёў — вельмі ж няроўныя сілы. «І бысць сеча»,— як пісалі нашыя першыя гісторыкі...

Але ў бітве аршанскі князь ацалеў. Дзіўнага тут мала — на князя, «блакітную кроў», цяжэй было ўзняць руку, чым на простага воя. Аднак ягоныя землі пераможцы ўсё ж падзялілі, а сам Усяслаў Шэры стаў выгнанцам. З летапісаў было загадана выкрасліць ягонае імя і ані ў якім разе не згадваць.

Ягоныя нашчадкі вярнуліся на радзіму — ты ж памятаеш звесткі пра той нядоўгі час, калі існавала Аршанскае княства? Але яны, відаць, пераймалі ад продка неўпакорлівы характар і таму былі, верагодна, знішчаныя злучаным войскам Вітаўта і Ягайлы. Суседзі, князі Друцкія, паддаліся войску ўладароў Вялікага княства і Кароны Польскай — і шырока разгаліноўваліся. Аршанскія ж князі перайшлі ў сферу легендаў. І нават салідныя генеолагі кажуць, што «князі Аршанскія, па ўсёй пэўнасці,— агульны назоў па месцы кіравання, а сам род невядомы».

Мы з табой дапіваем віно. Тут, на гарадзішчы. Дзе стаяў калісьці замак Усяслава Шэрага. Дзе аршанскія князі баранілі сваю незалежнасць.

Мы п'ем моўчкі. Бо — за адно і тое. І нявымаўленым тостам наплывае песня:

*Твой закон, што вазіць нявартыя гной*
*Чалавек такі і народ,*
*Калі вораг ад назвы іхнай адной*
*Не бялее, як снег і як лёд.*

---

САКРЭТ ФІРМЫ

# ГЕНЕАЛОГІЯ І ГЕРАЛЬДЫКА

Упраўленне міжнародных сувязей мае інфармацыю пра XXIV Міжнародны кангрэс па генеалогіі і геральдыцы, які адбудзецца ў Безансоне (Францыя) 2–7 мая 2000 года. Для ўдзелу ў кангрэсе неабходна ведаць французскую мову.

# ПРАГРАМА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Да 10 чэрвеня 1999 года прымаюцца прапановы па выпрацоўцы рабочай праграмы супрацоўніцтва з Пікардыйскім універсітэтам імя Ж. Верна (г. Ам'ен, Францыя).

*Усю дадатковую інфармацыю можна атрымаць ва ўпраўленні міжнародных сувязей (вул. Бабруйская, 7, пакой 416, тэл. 220-88-21).*

---

ПАШТОВАЯ СКРЫНЯ

# БЛІЗНЯТ СУСТРАКАЛІ АПЛАДЫСМЕНТАМІ

Нядаўна ў маім жыцці адбылася незвычайная падзея. Разам са сваёй сястрой я стала ўдзельніцай шоу блізнят, якое праходзіла ў студэнцкім гарадку Белдзяржуніверсітэта. У шоу ўдзельнічала 6 пар, якія навучаюцца на аднолькавых факультэтах, акрамя нас. Я — студэнтка філфака, а мая сястра навучаецца на хімічным факультэце. Усе ўдзельнікі паказалі свае таленты: песні, танцы, паказ мод, інсцэніроўка невялікай п'есы. У зале панавала сяброўская атмасфера, нас вельмі цёпла сустракалі. Пасля шоу была дыскатэка. Вельмі хочацца, каб такія мерапрыемствы праходзілі часцей.

*ТЫЧЫНСКАЯ*
*Вольга ці Таццяна?,*
*студэнтка, інтэрнат № 2*

# ДЫС-КА-ТЭ-КА!

Вось яшчэ адзін вечар надыйшоў у інтэрнаце БДУ № 7. І ён прайшоў бы незаўважаным, калі б не... доўгачаканая дыскатэка.

Ад аднаго гэтага слова, здаецца, інтэрнат ажывае. Студэнты бегаюць па паверхах, у пакоях — пярэпалах і зборы.

Што б мы рабілі без любімага ўсімі ды-джэя з мехмата Аляксандра Рамановіча! Гэта ж менавіта яму ўдаецца аб'яднаць танцуючых і выканаць нават самыя неверагодныя заяўкі студэнтаў. Кожны ведае, як праходзіць дыскатэка, але наша адрозніваецца тым, што на ёй няма ніводнага чалавека, які б сумаваў. Складаецца ўражанне, што кожнаму ўдалося знайсці "сваю палавінку". Мова музыкі аб'ядноўвае ўсіх.

*Марына ДВОРАК,*
*студэнтка 1-га курса філфака*

---

ЗЛЁТ

# "ШЛЯХ" ПЕРААДОЛЕЎ ПЕРАШКОДЫ

27–30 мая ў раёне спартыўнага комплекса "Раўбічы" адбыўся рэспубліканскі турыстычны злёт студэнтаў, арганізаваны Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам спорту і турызму і БПСМ.

Белдзяржуніверсітэт на злёце прадстаўляла каманда турклуба "Шлях". Акрамя турыстычных мерапрыемстваў, турклуб садзейнічае развіццю альпінізму і скалалазання.

У праграме злёту прадугледжвалася некалькі выпрабаванняў: турпаласа перашкод, кантрольна-турысцкі маршрут, турыстычнае арыенціраванне і вялікая конкурсная праграма.

Паспяхова пераадолеўшы перашкоды кантрольна-турысцкага маршруту, каманда заняла 3-е месца сярод 14 ВНУ рэспублікі.

*Аляксандр ГАВЯДЗІНАЎ,*
*студэнт 3-га курса фізфака*

# Слёзы марскіх німфаў

Захаплялька чароўнае здзіўленне, няспыннае жаданне пазнаваць дорыць чалавеку спрадвечная гармонія свету камянёў, якія патаемнымі нітамі злучаюць навуку, культуру і адукацыю. Пэўна, таму праз стагоддзі і тысячагоддзі пранесла чалавецтва любоў да гэтага цудоўнага ўтварэння. Сакрэт яго чароўнасці яшчэ і ў дасканаласці, непаўторнасці, прыгажосці. Нават калі вымаўляеш словы "каштоўны камень", гэта гучыць прыгожа, а дадаць "жэмчуг" — адразу перад вачыма ўзнікае вобраз пяшчотна-бялюткі з вясёлкава-пералівістай маціцай (перламутрам). Менавіта таму само слова "жамчужны" азначае высокую якасць і з'яўляецца сімвалам чысціні. Пэўна, вы здагадаліся, што сёння пойдзе размова пра гэты камень вышэйшага класа таму, што ён лічыцца шчаслівым каменем чэрвеня і асабліва пасуе людзям, якія нарадзіліся ў гэтым месяцы. Вядома, я запрашаю да вітрыны "Каштоўныя камяні", дзе побач з рубінамі, сапфірамі, апаламі і інш. месяцца дзве натуральныя жамчужынкі, знойдзеныя ў Міжземным моры і прывезеныя з Італіі. Такім чынам, расповед пра жэмчуг.



"Вялікая імператарская карона". Брыльянты, шпінель, жэмчуг. Работа І. Пазье. 1762 г.

Жэмчуг — гэта акруглае вапняковае ўтварэнне, якое знаходзяць у ракаўках марскіх і прэснаводных малюскаў (па-нямецку жэмчуг — Perl, а перламутр — Perlmuttr — маці жэмчуга). Руская назва, відаць, паходзіць ад кітайскага "чжэнь-чжу" праз "зэньчуг" — "слёзы марскіх німфаў".

Такой таямніцай прыроды ёсць вуглякіслы кальцыт. Прычынай гэтых адкладаў з'яўляюцца невялікія кавалачкі (пясчынкі, водарасці, маленькія ракаўкі), якія трапляюць унутр ракавін пад мантыю малюска і раздражняюць яго цела. Засцерагаючыся, малюск пакрывае чужароднае цела маціцай, слой за слоем. Расце малюск, расце і жамчужына, праз гады вырастае каштоўнае ўпрыгожанне.

Колер жэмчуга можа быць белым, жаўтаватым, ружовым і блакітнаватым — гэта лепшы сорт; а таксама шэрым, чырванаватым і (вельмі рэдка) блакітным, зялёным і чорным. Прыгожыя ўзоры супернічаюць па прыгажосці з дыяментамі, асабліва жамчужыны чорнага колеру (кожная з іх мае сваё асабістае імя). Пару такіх жамчужын, нібы сплеценых з ягад шаўкоўніцы, атрымала ў падарунак Пенелопа ў "Адысеі" Гамера. Жэмчуг не трэба апрацоўваць, яго непараўнальная прыродная дасканаласць, загадкавае ўнутранае зззянне і бясспрэчная прыгажосць дазваляюць выкарыстоўваць жамчужыны ў ювелірных упрыгожаннях, якімі можна цешыцца бясконца.

Промысел марскога жэмчуга мае старажытную гісторыю і вядзецца больш за 4 тысячы гадоў. Але за гэты час мала што змянілася. Збіраць малюскаў цяжка і небяспечна. Можна раскрыць каля ста ракавінак і толькі ў адной знайсці маленькі каменчык. Таму людзі з 1913 года пачалі вырошчваць жэмчуг у прамысловых маштабах — спярша марскі, а потым і прэснаводны. Безумоўна, прыродны заўжды быў даражэйшы, і не ўсе маглі мець жамчужнае ўпрыгожанне. Гэта камень царыц. Лічылася, што надзвычай прыгожую скарбонку з жэмчугу мела егіпецкая царыца Клеапатра. Самыя цудоўныя жамчужныя каралі ў Еўропе былі ў імператрыцы Кацярыны II і каралевы Шатландыі Марыі Сцюарт. Заходнееўрапейскія манархі любілі жэмчуг: прыклад гэтаму — сукенка Марыі Медзічы, упрыгожаная тысячамі жамчужын, якую яна апранула на хрышчэнне свайго сына, будучага караля Людовіка XIII. Жэмчугам упрыгожвалі вопратку, хатнія рэчы, аклады самых шанаваных абразоў, пераплёты кніг і какошнікі. Асабліва прывабныя, правільнай формы, чыстыя жамчужыны захоўвалі ў дзяржаўнай скарбонцы як вялікія каштоўнасці. Славутыя перліны недасяжнай велічыні і прыгажосці: "Каралева жамчужын" вагой 112 гранаў, "Перыгрына" — 264, "Рэгент" — 346, "Шах-Сафі" — 513, "Хонэ" — 1888 (адзін гран раўняецца 0,25 карата). Жамчужына "Перыгрына" зараз захоўваецца ў Іспаніі, а жамчужынай "Рэгент" валодаюць французы. Самая буйная жамчужына ў свеце — "Жамчужына Алаха", яна важыць 6,35 кг, перавышае памер какосавага арэха, знешне нагадвае галаву магаметаніна ў чалме, таму так і называецца. Знайшлі яе ў целе гіганцкай трыдакны (малюск вагой больш за 300 кг), якую злавілі ў 1934 годзе каля Філіпінскіх астравоў у Паўднёва-Кітайскім моры. Гісторыя гэта трагічная, бо рука лаўца была заціснута малюскам і лоў для яго аказаўся апошнім. Потым жамчужына, прыблізна ацэненая ў 42 млн. долараў ЗША, трапіла нью-йоркскім ювелірам.

Продкі рыхтавалі таксама лекі, расціраючы жамчужыны ў парашок і распускаючы ў воцаце для атрымання эсенцыі. Як лічылася, яна падтрымлівала сілы, захоўвала маладосць і прыгажосць. Напрыклад, можна прыгадаць эсенцыю, якую аднойчы падрыхтавала егіпецкая царыца і прапанавала Марку Антонію самую дарагую вячэру. Спачатку ўсё было звычайна, як і належыць правіцелям, але напрыканцы, калі падалі ў келіху віно, разумная Клеапатра загадкава пасміхнулася: на дне яго Антоній пабачыў завушніцу без прыгожай жамчужыны. Гэты выпадак адлюстраваў італьянскі мастак XVIII стагоддзя М. Джавані Батыста Т'епола (1696-1775) на сваёй знакамітай карціне "Пір Клеапатры".

Жэмчуг быў упадабаны і ў старажытнай Русі, шырока выкарыстоўваўся ў вышыўцы. Ён і цяпер з'яўляецца багатым упрыгожаннем. Зараз, у такі цудоўны летні месяц, калі вакол



Калье з жэмчугам.

такое суквецце фарбаў, жэмчуг асабліва прывабны і пасуе жанчынам любога ўзросту. І на адзенні рознага колеру ён выглядае шыкоўна. Ёсць яшчэ адзін сакрэт: жэмчуг можна насіць з іншымі камянямі, ён толькі падкрэслівае іх прыгажосць, дый сам нейк прыемна падміргвае маціцовым бляскам.

Знаёмства з каштоўнымі камянямі, разуменне прыроднай прыгажосці, жаданне спазнаць таямніцы прыроды даюць чалавеку вялікае задавальненне. Адказы на хвалюючыя пытанні і больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у музеі землязнаўства на геаграфічным факультэце.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*

Рэктарат, калектыў супрацоўнікаў і студэнтаў Белдзяржуніверсітэта і механіка-матэматычнага факультэта глыбока смуткуюць з нагоды гібелі падчас трагедыі, што адбылася на пераходзе станцыі метро "Няміга", студэнткі першага курса механіка-матэматычнага факультэта Марыны Бібіла і выказваюць спачуванне сям'і і блізкім Марыны.

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*3 чэрвеня*
*Зак. 421.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча*